**Літвіненка, А.** Погляд праз гады / А. Літвіненка ; гутарыў П. Кавалеўскі // Полацкі веснік. — 1999. — 12 лют. — С. 1—3.

# ПОГЛЯД ПРАЗ ГАДЫ

***15 лютага 1999 года спаўняецца 10 гадоў з дня вываду савецкіх войскаў з Афганістана. Наш карэспандэнт сустрэўся са старшынёй савета Полацкай арганізацыі ветэранаў Афганістана Літвіненкам Анатолем Антонавічам і папрасіў яго адказаць на рад пытанняў з нагоды прадстаячага юбілею.***

**– Скажыце, праз гады вы не змянілі свае погляды на Афганістан, на падзеі, удзельнікам якіх былі, на ўсё тое, што тады мы называлі прэстыжным найменнем — інтэрнацыяналізм?**

– Ні ў якім разе. Гэта было і гэта змяніць ужо нельга. Гэта гісторыя. Шкада, што ёсць у нас дзеячы, чыноўнікі, якія ў наш зменлівы час спрабуюць змяніць тое, што ўжо нікому змяніць не дадзена. «Чаму вы туды пайшлі? Чаму паступілі так, а не інакш?» Хіба пра гэта можна гаварыць сёння? Мы былі і застаёмся інтэрнацыяналістамі. Мы былі там па загаду Радзімы і дастойна выконвалі там свой вайсковы абавязак.

**– Як вы лічыце, ці мог у афганскім процістаянні быць нейкі іншы вынік?**

– Наўрад. Гэта горды, дастойны павагі народ. Афганцы любяць сваю радзіму. Нам хацелася ў нечым ім дапамагчы, але рабілі мы гэта вельмі нязграбна, груба, парушыўшы традыцыйна дружалюбныя адносіны афганцаў да іх вялікага паўночнага суседа, не ўлічваючы іх уклада жыцця, векавых традыцый.

**– Напачатку афганскай авантуры распаўсюджвалася думка аб тым, што варта нам толькі дапамагчы, і ў далёкім Афганістане запульсуе падобнае на наша жыццё: саветы, піянеры, камсамол, хаты-чытальні. Словам, яшчэ адна рэспубліка Саветаў**.

– Такое маглі прапаведваць людзі, якія не былі там, не ведалі гэтай краіны, гэтага народа. Не прыніжаючы яго, мушу сказаць, што гэта ў цэлым адсталы ад сучаснай цывілізацыі народ. Бедны, забіты. Любы грамацей, больш-менш цывілізаваны прайдоха, там можа павесці за сабой вялікія масы. Гэтым і карыстаюцца маджахеды. А што да нашых форм і ўмоў жыцця – дык тут па раду асноўных параметраў поўная несумяшчальнасць. Гэта акалічнасць пры актыўнай падтрымцы процістаячых СССР сіл Захаду і прывялі да выніку, які мы і атрымалі.

**– Як вы лічыце, інтэрнацыяналісты пасеялі толькі зерне нянавісці, варожасці на той зямлі, ці магчымы і іншы вынік?**

– Думаю, што адназначна адказаць на гэта нельга. І ўсё ж лічу, што ўзрасце там не адзін быльнёг. Мы былі там інтэрнацыяналістамі і, упэўнены, што многае ўспрынята тамтэйшым народам станоўча. Гэта хоць у нейкай меры кампенсуе незваротныя страты, якія мы там панеслі.

**– Вы маеце на ўвазе страты баявых сяброў?**

– Канечне. Толькі на Полаччыну не вярнулася 28 воінаў-інтэрнацыяналістаў. Наша рэгіянальная арганізацыя былых афганцаў налічвае сёння 277 чалавек. І галоўным запаветам кожнага яе члена з'яўляецца памяць аб загінуўшых, клопат аб іх родных і блізкіх, узаемадапамога.

**– Што вы можаце прапанаваць членам сваёй арганізацыі, сем'ям загінуўшых, якія ільготы ў адносінах інтэрнацыяналістаў сёння дзейнічаюць?**

– Лічу, што сам факт аб'яднання ў адной арганізацыі людзей з'яднаных агульным лёсам – ужо вялікая справа. Чалавек не застаецца сам-насам са сваімі ўспамінамі, сваімі жыццёвымі запатрабаваннямі, хваробамі. У нас, у Віцебску ёсць цудоўны рэабілітацыйны цэнтр. Па нашым накіраванні інтэрнацыяналісты праходзяць там поўны курс абследвання, лячэння. Не адмаўляе нам у дапамозе Полацкі ваенны шпіталь. Інтэрнацыяналісты бясплатна забяспечваюцца лекамі. Праезд у аўтобусах бясплатны.

А што яшчэ? Яшчэ для працуючых два тыдні водпуску за свой кошт у зручны для інтэрнацыяналіста час. Але некаторыя гаспадарнікі нярэдка падмяняюць такую трактоўку сваёй: у час, калі не церпіць ад гэтага вытворчасць. Прывілея, такім чынам, зводзіцца на “нет”.

Арганізацыя мае магчымасць аказваць і матэрыяльную дапамогу сваім членам.

**– За кошт чаго гэта магчыма?**

– Зразумела, што не толькі за кошт узносаў саміх інтэрнацыяналістаў. Мы ўдзячны многім прадпрыемствам і арганізацыям дзяржаўнай і недзяржаўнай уласнасці за рознабаковую дапамогу, у тым ліку і матэрыяльную. Гэта перш за ўсё гандлёвы дом “Стралец”, Наваполацкая арганізацыя па пастаўках нафтапрадуктаў, швейная фабрыка “Мона”, ВА ЖКГ, прадпрыемствы “Інтэркантакт”, “Еўратранзіт”, “Астран” паліграфічнае прадпрыемства “Спадчына Ф. Скарыны”, мэблевая фабрыка, ДБУ-2, ЦЭЦ, АП-2, электрасеткі, ГДК, гарадскі і раённы аддзелы сацабароны, ваенкамат, краязнаўчы музей. Словам, сяброў у нас многа і, спадзяёмся, што іх будзе яшчэ больш. Актывізацыя работы арганізацыі інтэрнацыяналістаў прыцягвае да яе ўвагу і спрыяе росту яе аўтарытэту. Вось толькі напрыканцы мінулага года ў нашу арганізацыю ўліліся ваенныя пенсіянеры-афганцы Баравухі-1 і Полацкага пагранатрада.

– Мы ўдзячны гарадскому выканаўчаму камітэту і гарадскому Савету дэпутатаў за падтрымку і садзейнічанне рабоце арганізацыі воінаў-інтэрнацыяналістаў.

**– Добрае імя арганізацыі стварае сваімі справамі яе актыў.**

– Безумоўна. Даводзіцца проста здзіўляцца энергіі і актыўнасці такіх нашых таварышаў, як Уладзімір Іванавіч Істомін, Яўген Канстанцінавіч Балаганскі, Іван Уладзіміравіч Акуленскі, Валерый Андрэевіч Зарубіцкі, Вячаслаў Мікалаевіч Рашэтнікаў, Уладзімір Анатольевіч Тамашэвіч і многія другія. У сувязі з прадстаячай юбілейнай гадавінай з дня вываду войск э Афганістана хацеў бы выказаць нашым баявым пабрацімам самую шчырую падзяку за высакародную працу ў імя светлай памяці паўшых, салідарнай падтрымкі жывых.

**А. Літвіненка, старшыня савета**
**Полацкай арганізацыі ветэранаў Афганістана**
**Гутарку вёў П. Кавалеўскі**